фестываль «Берагіня» ладзяцца раз на два гады. А хацелася б, каб свая «Берагіня» з'явілася ў кожнай вобласці, у кожным рэгіёне, каб гэтым рухам была ахоплена ўся Беларусь... Учора на канцэрце «Край ад калыскі дарагі» мы ўбачылі ўжо трэцяе пакаленне дзяцей, якіх «Берагіня» ў Акцябрскім далучыла да гаючага свету народнага мастацтва. Сістэма спрацоўвае. Фестываль «Радавод», ініцыятарам якога стаў Брэсцкі абласны цэнтр народнай творчасці, доўжыць справу «Берагіні», ладзіцца ў рэчышчы праекта «Традыцыйная культура і дзеці». І структура — тая ж: першы этап — навукова-даследчая экспедыцыйная дзейнасць вучняў пад кіраўніцтвам этнапедагогаў, другі — правядзенне чытанняў, развучванне сабраных песень і танцаў, што папярэднічае заключнаму абласному форуму.

Наталля Камзалава, намеснік дырэктара і мастацкі кіраўнік Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі:

— Пытанне стварэння праграм па этнакультурным выхаванні — адно з найбольш вострых. Мы распачалі гэтую работу. Летась Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Рэспубліканскі цэнтр краязнаўства абвясцілі трохгадовую акцыю «Жыву ў Беларусі і тым ганаруся». Мэта — папулярызацыя малой радзімы. Натуральна, акцыя ўключае і даследаванні этнаграфічных адметнасцей нашых гарадоў, мястэчак і вёсак. Але не паўсюль гэтая работа вядзецца паглыблена, і без падтрымкі навукоўцаў не абысціся.

2008 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Вячаслаў КАЛАЦЭЙ,**
*дэкан факультэта традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва дацэнт БДУ культуры і мастацтваў, кандыдат культуралогіі*

## Побытавы танец як аснова этнакультурнага выхавання

У сучаснай гуманітарыстыцы існуюць асобныя навуковыя адгалінаванні — кінэтыка і праксіміка, якія *вывучаюць асаблівасці рухаў, жэстаў як прыкметы этнічнай і індывідуальнай псіхалогіі, паводзіннай культуры асобы і паводзіннай культуры чалавечых супольнасцей*. Ці здольны чалавек існаваць без руху, перасоўванняў, пераадолення адлегласцяў? Хіба толькі ў інвалід-

ным крэсле пад наглядам спецыялістаў. Далёка не ўсе здольны паспяхова займацца кібернэтыкай, алейным жывапісам, структурнай лінгвістыкай, напісаннем камп'ютэрных праграмаў — ды гэтыя заняткі і не з'яўляюцца ўключанымі ў працэс жыццезабеспячэння сярэднестатыстычнай асобы, — затое рухацца, каб жыць, павінны амаль усе. Тое, як мы рухаемся ў пэўных абставінах (калі змагаемся, працуем, прымаем ежу, адпачываем), таксама абумоўлена культурай, якая нас абкружае з дзяцінства.

Культура народа ўвасабляе яго своеасаблівы «нярвовы цэнтр» — ментальнасць, мадэлі паводзін, духоўныя і практычныя навыкі выжывання ў заўсёды няпростым навакольным свеце. Яна — спадчына-запавет шматлікіх папярэдніх генерацый продкаў. Беларуская *абрадавая харэаграфія*, *традыцыйныя гульні з рухам, народны* (т. зв. «побытавы») *танец* — часткі народнага мастацтва беларусаў — далёка не апошнія са складальнікаў іх этнічнай культуры. Яны ў значнай (калі ўлічыць вышэйсказанае пра рух і жыццё, то ў вельмі значнай) ступені выконвалі этназахаваўчую функцыю і функцыю сацыяльнай адаптацыі беларусаў. Увогуле этнічнае мастацтва было нагэтулькі глыбока інтэгравана ў побыт, светасузіранне людзей на абшарах ад узгоркаў і выспаў Падзвіння да палескіх нізінаў, якіх апісвалі, запісвалі, здымалі апошнія 200 год (ад Марыі Чарняўскай да Зінаіды Мажэйка), што нават зараз пад «постіндустыяльным» прэсінгам XXI ст. яно ўсё яшчэ мае шанец на жыццё і спадкаемства на Беларусі. Таму апошняе слова ў гісторыі беларускага побытавага танца, традыцыйных карагодаў і гульняў вясковай культуры (падобна, як і ў гісторыі спробаў навучыць ім) сёння яшчэ не сказана.

Мэта гэтага артыкула — вызначыць асноўныя праблемы, невырашанасць якіх замінаеператварыць сёння такі жанр народнай музыкі, як побытавы танец, у агульнапрыняты ў сістэме адукацыі сродак этнакультурнага выхавання.

***Фальклорны рух і спецыяльная дыдактыка.*** Патрэба сістэмна суаднесці выхаваўчы працэс у галіне навучання дзяцей і моладзі народнай харэаграфіі з канцэпцыяй нацыянальнага культурнага адраджэння Беларусі (ідэі якой у чарговы раз зазіхацелі ў 80–90-я гг. XX ст.) і сёння як ніколі актуальна для Беларусі. Шматгадовае вывучэнне скарбаў народнага мастацтва, выпрацаваны такім чынам густ і жыццёвы досвед падводзяць да высноў, што «ад танцавальнай творчасці ніяк нельга адлучыць і пытанні этыкі, маральнага і фізічнага выхавання» і «чалавек, які атрымаў элементарнае выхаванне на ўзорах сапраўднага народнага танца,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мае неабыякавыя адносіны і да мастацтва народнага касцюма як часткі народнай і матэрыяльнай нацыянальнай культуры, што непадзельна з гісторыяй народа; у яго больш развіты густ і абвостранае ўспрыняцце прыгажосці»[3]. Падыходы і методыкі[4], якія былі прапанаваны і (што нетыпова для большасці навуковых канцэпцый і тэорый), здаецца, паспяхова ўвасобіліся ў жыццё ў рамках шэрагу ніжэйпералічаных праектаў.

Асноўная пляцоўка эстэтычнага выхавання дзяцей сродкамі фальклору на Беларусі сёння — фальклорныя ансамблі пры ўстановах адукацыі і ўстановах пазашкольнага навучання і выхавання. Метадалагічная невыверанасць працы ў іх адкрыла шырокі шлях разнастайным сурагатным формам, якія літаральна запаланілі падмосткі дзіцячых конкурсаў, аглядаў, канцэртаў. У выніку сапраўднай вясковай культуры месца там не засталося. У асяродку дзіцячых калектываў народнага танца і спеваў пануе тое ж самае, што і ў прафесійных «народных» калектывах: засілле штампаў і ўсерэднёнай «псеўда-славянскай» культуры. Гэта ўжо зусім не тая культура, не тое мастацтва беларусаў, якія «народныя» калектывы павінны захоўваць і прапагандаваць. Задачы, якія перад такімі калектывамі ставіліся, за выкананне якіх іх кіраўнікі атрымліваюць заработную плату, не выконваюцца. Напэўна, каб рэальна ўяўляць хібы і перавагі існуючых спосабаў далучэння дзяцей на традыцыйнай культуры, трэба, перш-наперш, удакладніць некаторыя асноўныя паняцці, якія выкарыстоўваюць у асяродку дзеячоў мастацтва — «народнікаў». Навукоўцы прапануюць пэўныя недвухсэнсоўныя вызначэнні такіх «адзінак» народнай творчасці, як «фальклорны ансамбль» (табл. 1), «народная песня», «народны танец», «абрад», «ігрышча». Калі падоўжыць, развіць гэтыя вызначэнні з папраўкамі на адукацыйна-выхаваўчыя акалічнасці, то атрымаем і вызначэнне «дзіцячы фальклорны ансамбль».

Прычым тут маецца на ўвазе далучэнне не да *традыцыйнай культуры, фальклору ўвогуле*, а да фальклору, да *этнакультурнай спадчыны свайго рэгіёна, сваёй вёскі, сваёй малой радзімы*. Як паказала 30-гадовая практыка ўстаноў адукацыі і культуры краіны, пры невыкананні гэтай умовы дзейнасць калектываў

[3] Козенка М. А. Пачатковае харэаграфічнае навучанне: Праграмы для I–IV класаў агульнаадукацыйных школ. — Мн.: НЦТДМ, 1998, — С. 3.

[4] Асноўныя працы, дзе выкладзены погляды харэографа на навучанне народнаму танцу: Козенка М. А. Лексіка беларускага народнага танца; Козенка М. А. Пачатковае харэаграфічнае навучанне: Праграмы для I–IV класаў агульнаадукацыйных школ — Мн.: НЦТДМ, 1998.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Табліца 1*

**Вызначэнні адзінак фальклорнага руху**

| Фальклорны ансамбль | Дзіцячы фальклорны ансамбль |
|---|---|
| Устойлівая суполка выканаўцаў, якія ўдзельнічаюць у адпраўленні народных абрадаў* | Суполка дзяцей-выканаўцаў пад кіраўніцтвам прафесійнага педагога альбо лідэра-аматара, ў якой наладжаны працэс далучэння іх да выканаўчай практыкі ў межах мясцовай аўтэнтычнай фальклорнай традыцыі |

* Восточно-славаянский фольклор: Словарь науч. и народн. терминологии. — Мн.: Наука и техника, 1993.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пэратвараецца ў фармальныя заняткі харэаграфіяй, харавымі спевамі, ансамблева-інструментальным выканаўствам, акцэнт у якіх перанесены не на захаванне народных традыцый, а на падгонку фальклору пад штучна створаныя сцэнічныя штампы. Гэта само па сабе мае права на існаванне, але мусіць быць разгледжана не як ф а л ь к л о р, а як а м а т а р с к а я к а н ц э р т н а - с ц э н і ч н а я т в о р ч а с ц ь у галіне харэаграфіі, харавога мастацтва ці інструментальнай музыкі.

У ф а л ь к л о р н а - э т н а г р а ф і ч н ы х г у р т а х, дзе навучанне вядзецца «*з нагі на нагу*», «*з горла на горла*» — метадам «уключанага назірання», — калі навучэнец *працяглы час* не выкрэслены з асяродку носьбітаў традыцыі, да якой далучаецца, вынікі праяўляюцца самі па сабе: пасля «прышчэпкі» аўтэнтычнасці выхаванец дзе не дабраў ад выхаваццеля-носьбіта сістэмна-тэарэтычна, там дабярэ самастойна, пазней. Пры навучанні ў асяродках, дзе т р а д ы ц ы і н я м а (*горад; мясцовасць, дзе носьбітаў не захавалася, альбо выхавацель не мае магчымасці забяспечыць з імі рэгулярны кантакт; тэрмін навучання абмежаваны навучальным планам установы*) патрабуюцца сістэма, выверaная дыдактыка. Іншымі словамі: абмежаваны тэрмін, на які ставяцца пэўныя навучальныя задачы і ў які ўкладаюцца крокі па дасягненню апошніх. Прыкладам паступеннай сістэмы з выверанай дыдактыкай далучэння да беларускага танца (да традыцыйнай культуры праз побытавы танец) можа быць навучальны курс «Пачатковае харэаграфічнае навучанне». За недахопам месца ніжэй зроблена спроба змясціць яго ў адну схему (табл. 2).

*Табліца 2*

**Рэпертуарныя асновы праграмы «Пачатковае харэаграфічнае навучанне» ***

| Год навучання | Пачатковае харэаграфічнае навучанне | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Сродкі | | Элементы | Азбука | Рэпертуар | | | |
| | карагоды | танцы | | | гульні | парныя танцы | гуртавыя танцы | сольныя танцы |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| Першы | «А мы проса сеялі»; «Мак»; «Падаляначка»; «Перапёлачка» | «Лявоніха»; «Просты танец» | Пазіцыі ног: I, II, III; пазіцыі рук: I, II, III; палажэнне en face i epaulement croige | Паклон; танок (лінія, кола, калона); вароты; ручаёк; гарох | «Явар»; «Апанас, лаві нас»; «Верабей»; «Заінька»; «Повад»; «Ляскаўка»; «Рыбка»; «Пераскочка»; «Кабылка»; «Мак» | «Бобік»; «Матлёт»; «Свеціць месяц»; «Завіруха» | *Карагоды:* «А мы проса сеялі» (лінія); «Мак»; «Падаляначка»; «Перапёлачка»; «Сонейка»; «Пеўнік»; *танцы:* «Лявоніха»; «Просты танец»; «Нітачка-іголачка»; «Церніца» | — |

* За дэфіцытам месца матэрыял дадзены выбарачна, з мінімальнымі паўторамі таго, што было ў папярэдніх гадах навучання.

*Прадаўжэнне табл. 2*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Другі | «У карагодзе мы былі»;<br>«А мы проса сеялі»;<br>«Грушка» | «Церніца»;<br>«Заёнец» | Пазіцыі ног: I–зав II–зав, IV;<br>пазіцыі рук: IV–VIII;<br>Demi-plie;<br>Grand-plie;<br>Battement tendu;<br>Pigue;<br>Passe par terre en dehors;<br>Releve | Маталачка;<br>маятнік;<br>калупалачка;<br>нажніцы;<br>галоп;<br>бег | «Сею, сею мак»;<br>«Трэці лішні»;<br>«Змяні пару»;<br>«Рося»;<br>«Казёл»;<br>«У квача» | «Базар» (I вар);<br>«Кракавяк» (I вар);<br>«Трыбушкі»;<br>«Аляксандра»;<br>«Галёп»;<br>«Субота»;<br>«Кацярынка» (I частка) | *Карагоды:*<br>«А мы проса сеялі» (кола);<br>«Грушка»;<br>«У карагодзе мы былі»;<br>«Крывы танок»;<br>*танцы:*<br>«Полька-тройка»;<br>«Нітачка-іголачка»;<br>«Лявоніха»;<br>«Ланцуг»;<br>«Латышка» | «Заёнец» («Зайчык») у форме маналога |
| Трэці | «А мы сеялі, мы сеялі лянок» | «Чобаты»;<br>«Народны вальс» | Пазіцыі рук: VII–X;<br>Passe par terre;<br>Round de jembe en l'air;<br>Preparation; | Малаточкі;<br>нажніцы;<br>вяровачка;<br>прысюды;<br>калупалачка;<br>балянсэ; | «Кукушачка»;<br>«У рожу»;<br>«Хто спрытнейшы»;<br>«Дзяркач» | «Карапет»;<br>«Падэспань»;<br>«Базар» (II вар)<br>«Кацярынка» (II частка) | *Карагоды:*<br>«Ляцелі дзве пцічкі»;<br>«Цар за горадам гуляе»; | «Зайчыкчы-бірайчык» (маналог, дыялог);<br>«Чобаты» (маналог);<br>«Прыпеўкі» (маналог) |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Заканчэнне табл. 2*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Трэці | | | Battement releve lent; Battement fondu; Saute | па-дэбаск; падбіўка; галоп; полька | | | *танцы:* «Лянцей»; «Лявоніха тройкамі»; «Мікіта» (II вар) «Полька з камандамі»; «Грачанікі» | |
| Чацвёрты | — | «Мітусь»; «Крутуха»; «Таўкачыкі»; «Абэрак» | Пазіцыі рук: X–XII: Battement tendu+ demi-plie; Pas degage; Round de jambe par terre; Balansoi; Grand battement gete; Croisse; Saute | Прысюды; галубец; па-дэбаск; падбіўка; галоп; полька; прысядка; круцёлкі; рэвальтад | «Разявака»; «У злодзея»; «Ку-ку» | «Базар» (III вар); «Шахцёр» (II частка); «Полька-бабка»; «Вянгерка» | *Карагоды:* «А мы сеялі лянок»; «У Трыфана»; «Дрыма»; *танцы:* «Нажніцы»; «Падлэспань з пераходамі»; «Шахцёр» (кругавы); «Сажана полька»; «Грачанікі» (са спевамі) | «Лявоніха» (у форме дыялога); «Чобаты» (у форме дыялога); «Прыпеўкі» (у форме дыялога) |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такі спосаб падачы матэрыялу даволі складаны, таму падаецца неабходным наступны каментар. Канчатковая «падсумаваная» (агульная) мэта курса — рэпертуар: *набор гульняў, карагодаў, танцаў, якія засвоіць навучэнец за чатыры гады.* На шляху да дасягнення мэты аб'яднаны сродкі, формы, шляхі навучання. Яны тэзісна, з апорай на пэўны харэаграфічна-дыдактычны матэрыял акрэслены ў:

• с р о д к а х (пераліку *найпрасцейшых складальнікаў — «літар» пластычнай мовы*; яны дадзены ў выглядзе найпрасцейшых спалучэнняў у пэўных традыцыйных карагодах і танцах, назвы якіх і змешчаны ў табл. 2);

• э л е м е н т а х (ці «элементах класічнага танца»? з якімі пры жаданні навучэнцаў знаёмяць паралельна як са *сродкамі фарміравання акадэмічнай культуры пластыкі цела*, накіраванай на прафесійныя заняткі харэаграфіяй у перспектыве);

• а з б у ц ы (у «азбуцы і арнаменце беларускага танца» аб'яднаны розныя групы танцавальных элементаў — своеасаблівых *знакаў* народнай харэаграфіі; якія складаюцца ў своеасаблівы набор — *тэзаўрус*[5] самабытнай харэаграфічнай мовы беларусаў).

Такая (у выглядзе табліцы) падача матэрыялу, безумоўна, не самая выгодная, але прафесіянал альбо чалавек, які сутыкаўся з традыцыйным побытавым танцам, збольшага разбярэцца, што да чаго. Што тычыцца часу заняткаў, тэматычны план навучання выглядае наступным чынам (табл. 3). У дужках даецца колькасць гадзін для факультатыўных заняткаў (колькасць гадзін у год).

*Табліца 3*

**Прыкладны тэматычны план праграмы «Пачатковае харэаграфічнае навучанне»**[6]

| Тэма | Год навучання | | | | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|
| | I | II | III | IУ | |
| Сродкі стварэння мастацкага вобраза | 6 (16) | 5 (14) | 5 (11) | 4 (10) | 20 (51) |
| Элементы класічнага танца | 3 (11) | 4 (9) | 4 (10) | 5 (10) | 16 (40) |
| Азбука і арнамент беларускага народнага танца | 9 (13) | 8 (15) | 7 (16) | 7 (17) | 31 (61) |
| Харэаграфічны рэпертуар і яго музычнае суправаджэнне | 14 (24) | 15 (26) | 16 (27) | 16 (27) | 61 (104) |
| Агульная колькасць гадзін | 32 (64) | 32 (64) | 32 (64) | 32 (64) | 128 (256) |
| Усяго | 96 | 96 | 96 | 96 | 384 |

[5] Тэзаўрус — слоўнік, пералік усіх магчымых элементаў.

[6] Козенка М. А. Пачатковае харэаграфічнае навучанне: Праграмы для I–IV класаў агульнаадукацыйных школ. — Мн.: НЦТДМ, 1998. — С. 10.



РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

Эфектыўнасць вышэйпрыведзенай праграмы і падыходаў да традыцыйнай танцавальнай культуры Беларусі, якія прапанаваў пры навучанні дзяцей народнаму танцу М. Козенка (метад уключанага назірання; па магчымасці непарыўнасць («з нагі на нагу») традыцыі пры навучанні; комплекснасць навучання з улікам жанравай непадзельнасці фальклору (ланцуг «танец — інструментальная музыка — спевы — касцюм — святы»); неабходнасць «жывых» формаў праяўлення традыцыі — ў фэстах, святах, рэгіянальных конкурсах), праявілася адразу ў некалькіх галінах культурнага і грамадскага жыцця Беларусі 1990-х і 2010-х гг.

***Доўгатэрміновыя фальклорныя праекты і фестывальны фальклорны рух.*** У 2000 г. Саветам Міністраў краіны была зацверджана «Праграма аховы народнага мастацтва і народных промыслаў і рамёстваў у Рэспубліцы Беларусь». У яе межах у шэрагу раёнаў Беларусі падоўжаны распачаты на прыканцы 90-х гг. эксперыментальны праект «Танцавальны фальклор і дзеці». Каардынацыю праекта ажыццяўляе лабараторыя традыцыйнага мастацтва Беларускага дзяржаўнага інстытута праблем культуры. Намаганнямі яе супрацоўнікаў да праграмы падключаецца сістэма адукацыі: з 2002 г. праграма стала абавязковай для ўстаноў адукацыі Міншчыны.

У краіне наладжана сістэма фестываляў народнага мастацтва, дзе фальклорныя калектывы, у тым ліку і дзіцячыя, маюць магчымасць заявіць пра сябе. Гэта міжнародныя фестывалі «Звіняць цымбалы і гармонік» у Паставах (усе жанры), «Сожскі карагод» у Гомелі (харэаграфія). Трэба, аднак, заўважыць, што большасць калектываў, якія бяруць у іх удзел з боку Беларусі, зарэнтаваны ўсё ж такі на самадзейныя формы народнага мастацтва. У Мінскім палацы моладзі праводзяць сталічны фальклорны фестываль дзіцячых і юнацкіх калектываў «Залаты птах». Апошнім часам (з арганізацыйнай і метадычнай падтрымкай аддзела традыцыйнай культуры БелдзяржІПК) моцна заявіў пра сябе як скіраваны на аўтэнтычныя формы фэст «Беларуская полька» (пераважна харэаграфія), што ладзілі пераважна на Чачэршчыне. Было праведзена некалькі фестываляў «Мядоцкі край і яго таленты» (усе жанры — фестываль фальклорнага мастацтва) у Барысаўскім раёне. У 2009 г. 10-гадовы юбілей адзначыць рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва «Берагіня» у г. п. Акцябрскі — ўзор канцэптуальнага праекта па этнакультурным выхаванні сродкамі традыцыйнай харэаграфіі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Адукацыйна-выхаваўчы працэс у галіне традыцыйнага мастацтва.*** У Мінску на формы навучальнага працэсу з актыўным выкарыстаннем узораў аўтэнтычнага фальклору з 1990-х гг. скіраваны дзіцячы спеўна-харэаграфічны гурт Таццяны Пладуновай «Верас» і Марыі Плашчовай «Гронка» НЦМТДМ, фальклуб «Маладзёвы» Ірыны Мазюк з Беларускай мастацкай акадэміі, з якога напачатку XXI ст. ўтварыўся гурт «Кудзьмень».

Мінская вобласць.

*Мінскі раён.* Выхаванцы таленавітага педагога Ларысы Рыжковай (в. Міханавічы), выдатна авалодаўшыя аўтэнтычнымі спевамі (за некалькі гадоў існавання яе гурт «Калыханка» стаў узорным), апошнім часам таксама актыўна далучаюцца да танцавальнага руху. Выдатны калектыў «Жыццё» пад кіраўніцтвам Святланы Жук з'явіўся ў в. Чурылавічы.

*Барысаўскі раён.* Сярод калектываў Барысаўшчыны, цікавы і разнастайны досвед працы якіх варта адзначыць, — ансамбль «Берагіня» з вёскі Мётча (кіраўнікі А. Абрамовіч і М. Козенка), дзіцячы фальклорны калектыў Карсакавіцкага СДК (кіраўнік Ларыса Піліпёнак); фальклорны калектыў «Прыданкі» вёскі Навасёлкі (арганізатар Інэса Небышынец); фальклорны калектыў «Лаўнічанка» (кіраўнік Ганна Казлова); фальклорны калектыў «Спадчына» (кіраўнік Васіль Шутко).

*Любанскі раён.* Тут сваім майстэрствам выдзяляюцца: фальклорны танцавальны ансамбль «Расіца» і дзіцячы танцавальны гурт «Расічка» в. Сарачы (педагог-лідэр Надзея Крупянькова); дзіцячы фальклорна-этнаграфічны гурт «Нашчадкі» в. Забалаць (педагог-лідэр Ірына Караліс); дзіцячы фальклорна-этнаграфічны гурт «Верабейкі» г. Любань (педагог-лідэр Сяргей Выскварка); народны дзіцячы ансамбль «Вытокі» в. Сосны (педагог-лідэр Любоў Серавокая).

Гомельская вобласць.

*Акцябрскі раён.* Можна ганарыцца існаваннем на Акцябршчыне такіх носьбітаў традыцыі, якія перадаюць свой досвед моладзі і дзецям, як: фальклорны гурт в. Валосавічы; гурт в. Гаць; сталыя спявачкі і моладзь, якая ім спадкуе, з в. Майсееўка, Пратасы, Рассвет; удзельнікі фальклорнага гурту в. Ляскавічы і Забалацце; гурт в. Новая Дуброва; пяцёра шаноўных спявачак з в. Слабодка; сям'я Беразоўскіх з гурту в. Харомцы, калектыў «Вечарына» з вёскі Харомцы; з в. Чырвоная Слабада; удзельнікі дзіцячых фальклорных калектываў «Рудабельскія зорачкі», «Цярэшкавы шчодрыкі»,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«Некрашынка» і «Брачынскія музыкі», кіраўнікі якіх актыўна далучаюць сваіх вучняў да мясцовай культурнай спадыны.

*Чачэрскі раён.* На занятк і па традыцыйнаму мастацтву, музыцы і танцах у школы, клубы вёсак Мяркулавічы, Бабічы, Нісімкавічы, Бяляеўка, Матнявічы, Бацвінава, Залессе прыходзяць вучыць сваіх унукаў спявачкі і знаўцы гульняў, майстры і танцоры — адмысловыя носьбіты традыцыйнай культуры. Магчыма адзначыць гурты «Надзея» і «Крынічка», ансамбль з вёскі Валосавічы і «Лёс» з вёскі Бабічы.

*Дрыбінскі раён* — ансамбль «Вытокі».

Віцебская вобласць.

Чуйнасць, любоў да роднай Віцебшчыны на вельмі моцным мастацкім і этнаграфічным узроўні сведчыць тэатр фальклору «Цярэшка» Глыбоцкага дома культуры. У Расонах традыцыйным побытавым танцам, гульнямі і спевамі, інструментальнай музыкай актыўна заняўся гурт «Нежачкі» Цэнтра дзіцячай творчасці, арганізаваны Валянцінай Ліцьвінавай, у Лепелі — калектыў «Сунічкі» Маргарыты Шыпулі.

Брэсцкая вобласць

Магчыма адмыслова адзначыць калектыў «Палескія званочкі» з вёскі Мілавічы *Жыткавіцкага раёна.* Надзвычай вялікая работа праведзена пры падрыхтоўцы і правядзенні двух рэгіянальных фестываляў «Радавод» (ідэя і менэджмент — Людміла Бярней), дзе праявіліся: калектыў «Пралесачкі» Кобрынскага ЦПР пад кіраўніцтвам Святланы Чырун; выдатны фальклорны гурт «Ліпачка», якім кіруюць Уладзімір Дзячок і Марыя Сукач з в. Ліпнікі *Драгічынскага раёна.*

Цяжка ўявіць, што ўсё гэта збольшага «матэрыязавалася» і «легалізавалася» і шмат у чым дзякуючы своеасабліваму «каталізатару» ў выглядзе аднаго чалавека. Дзейнасць у галіне традыцыйнага побытавага танца Беларусі, распачатая этнахарэографам Міколам Козенкам і яго аднадумцамі з аддзела традыцыйнага мастацтва БелДІПК, пазначыла шэраг **праблем**, якія тычацца не толькі традыцыйна-побытавага танца, але і *традыцыйнай культуры, фальклорнай асновы нацыянальнай культуры Беларусі* ўвогуле, якія сёння патрабуюць тэрміновага вырашэння.

Асноўнымі праблемамі, без вырашэння якіх немагчыма паўнаякасна зрабіць традыцыйную музыку, побытавы танец дзейснымі сродкамі этнакультурнага выхавання, з'ўляюцца наступныя:



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1) *адрасная недакладнасць дзяржаўнага падыходу да праблематыкі этнакультурнага выхавання.* У Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь традыцыйнай культурай займаюцца, але яны не абавязаны займацца пераемнасцю і педагогікай. У Міністэрстве адукацыі Рэспублікі Беларусь сфера этнапедагогікі дакладна не выдзелена нават у структуры адміністрацыйных органаў. Фальклор далучаюць да эстэтычнага, мастацкага выхавання і практыкуюць да яго адпаведныя падыходы. Гэта, як правіла, душыць фальклор у дзіцячых «народна арыентаваных» гуртках і калектывах, якіх бессэнсоўна «цягнуць» да набіўшых аскоміну тытулаў «узорны», «народны». Крытэрыі кшталту: «спадніцы аднoй даўжыні», «паклон з усмешкай», «абавязковае трохгалоссе», «тры ансамблевыя групы: хор, балет, аркестр» даўно патрабуюць перагляду. Трэба браць прыклад з Расіі, дзе праблемамі этнічнай культуры ў сістэме адукацыі займаецца спецыяльны сектар у аддзеле выхавання пры Міністэрстве адукацыі, а галоўны крытэрый пры адборы калектываў на фальклорныя фестывалі — адпаведнасць мясцовай традыцыі;

2) *адсутнасць дзяржаўнай інфраструктуры дзейнасці па этнакультурным выхаванні.* Спецыялісты быццам бы ёсць — БМА, БДУ культуры і мастацтваў, БДПУ імя М. Танка, БАМ, БДУ, вучэльні і каледжы сфераў адукацыі і культуры. Але іх выпускнікі фактычна не здольны сябе праявіць: няма сістэмы рэгулярных фэстаў, змен ў летніках — сістэмы стымулявання і абмену вопытам спецыялістаў у галіне этнапедагогікі. Усё, што адбываецца ў гэтай галіне, — адбываецца не «згодна», а «насуперак» культурна-адукацыйнай заведзёнцы. Інфраструктуру дзейнасці ў галіне этнакультурнага выхавання трэба тэрмінова ствараць.

Пры дэталёвым разглядзе гэтыя праблемы «распаўзаюцца» на шэраг больш дробных: метадычная і рэпертуарная незабяспечанасць, кадравае пытанне ў рэгіёнах, матэрыяльная забяспечанасць навучальнага працэсу. Гэтыя праблемы абумоўлены, вядома, агульнай «няўнятнасцю» дзяржаўнай палітыкі ў галіне адукацыі і культуры, але гэта не значыць, што яны будуць бясконца чакаць свайго вырашэння. Не хацелася б, каб вядомы парафраз: «Аднойчы вы прачнецеся і заўважыце, што вы вымерлі», — нейкім чынам стаў актуальным для этнапедагогаў і ўвогуле беларусаў як этнічнай супольнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ